H43

БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 21 красавіка 2008 года, № 8–9 (1980–1981)

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

***Пагадненне аб супрацоўніцтве Беларускага дзяржаўнага універсітэта з В'етнамскім нацыянальным універсітэтам падпісалі 7 красавіка ў Ханоі кіраўнікі дзвюх ВНУ Васіль Стражаў і Май Чонг Ньюан. Рэктар БДУ знаходзіўся ў Сацыялістычнай Рэспубліцы В'етнам у складзе дэлегацыі нашай краіны на чале з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.***

# БДУ – В'ЕТНАМ

Паводле падпісанага пагаднення будзе ажыццяўляцца абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі для навучання, стажыроўкі і вучэбнай практыкі, запрашэнне выкладчыкаў і даследчыкаў для чытання лекцый і вядзення практычных заняткаў. Бакі дамовіліся таксама абменьвацца інфармацыяй па вучэбна-метадычнай рабоце, вучэбных планах і праграмах, навукова-тэхнічнай літаратурай і перыядычнымі выданнямі, праводзіць сумесныя даследаванні, семінары і канферэнцыі.

Васіль Стражаў наведаў яшчэ Нацыянальны цэнтр Міністэрства абароны В'етнама, спецыялісты якога зацікавіліся шэрагам навукова-тэхнічных распрацовак БДУ, найперш у галіне аховы інфармацыі і радыёфізікі. Акрамя таго, рэктар нашага універсітэта ўдзельнічаў у перамовах міністэрстваў адукацыі Беларусі і В'етнама, а таксама ў сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі з в'етнамскімі выпускнікамі беларускіх вышэйшых навучальных устаноў.

**Наталля КУХАРЧЫК**

### ДАВЕДКА

БДУ ў савецкі час быў вызначаны базавай вышэйшай навучальнай установай па падрыхтоўцы спецыялістаў для СРВ. У 60–90-я гады мінулага стагоддзя ў нашым універсітэце прайшлі навучанне каля 700 в'етнамскіх грамадзян. Супрацоўніцтва БДУ з гэтай краінай узнавілася ў 2004 годзе, калі Белдзяржуніверсітэт наведала афіцыйная дэлегацыя СРВ. Цяпер у нас навучаецца 45 в'етнамцаў. У 2007 годзе за шматгадовае і плённае супрацоўніцтва ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі В'етнама БДУ ганараваны высокай дзяржаўнай узнагародай СРВ – ордэнам Сяброўства.

# ВІЗІТ У АДКАЗ

**Дэлегацыя з Венесуэлы на чале з рэктарам Нацыянальнага эксперыментальнага універсітэта імя Сімона Радрыгеса (UNESR) Мануэлем Антоніо Марынья Мюлерам 10 красавіка наведала Беларускі дзяржаўны універсітэт.**



*Рэктар UNESR Мануэль Мюлер (другі справа) разам з дэлегацыяй паўднёваамерыканскага універсітэта на перамовах з кіраўніцтвам БДУ.*

Госці сустрэліся з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым. Былі абмеркаваны канкрэтныя шляхі рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве, якое было падпісана ў снежні мінулага года падчас удзелу кіраўніка нашага універсітэта ў рабоце Нацыянальнай выставы Беларусі ў сталіцы Венесуэлы горадзе Каракасе. У выніку было вырашана стварыць камісіі па міжнародных акадэмічных абменах, па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, а таксама па інавацыйнай дзейнасці, трансферы тэхналогій і стварэнні сацыяльна-арыентаваных прадпрыемстваў.

Пасля паўднёваамерыканскія госці завіталі ў Музей гісторыі БДУ, пабывалі на фізічным, геаграфічным факультэтах, а таксама наведалі факультэт журналістыкі, дзе пазнаёміліся з тэлецэнтрам і тэлестудыяй і пагутарылі со студэнтамі.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ВЫНІКІ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КОМПЛЕКСУ БДУ ЗА 2007 ГОД**

З даклада прарэктара па эканоміцы і інвестыцыях Уладзіміра СПІРЫНА.

Стар. 2

**ДРУГАЯ МАЛАДОСЦЬ МЕХМАТА**

Інтэрв'ю з дэканам механіка-матэматычнага факультэта Міхаілам ЖУРАЎКОВЫМ з нагоды 50-годдзя мехмата.

Стар. 3

**АДУКАЦЫЯ БЕЗ МЕЖАЎ**

Акадэмічная мабільнасць становіцца ключавым звяном сусветнай сістэмы адукацыі, і беларускія студэнты актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных абменах.

Стар. 6

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# СУСВЕТНАЕ ПРЫЗНАННЕ

***Каманда студэнтаў ФПМІ БДУ стала бронзавым прызёрам Чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM–ICPC).***




*Уладальнікі "бронзы" Чэмпіянату свету па праграмаванні (злева направа): Уладзімір Керус, Павел Іржаўскі і Мікіта Леснікаў.*

У фінале чэмпіянату, які адбыўся 9 красавіка ў канадскім горадзе Банф, бралі ўдзел сто камандаў з 33-х краін. За пяць гадзін студэнты мусілі рашыць 11 задач па камп'ютарным праграмаванні высокай ступені складанасці, якія мадэлявалі праблемы сучаснага бізнэсу. Нашы студэнты Мікіта Леснікаў, Павел Іржаўскі і Уладзімір Керус рашылі 6 з прапанаваных задач, апярэдзіўшы сваіх калег з Оксфарда, Прынстана, Токіо, Тайваня, Варшавы, Пекіна і іншых адукацыйных цэнтраў свету. Пераможцай спаборніцтваў стала каманда Санкт-Пецярбургскага універсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі.

Беларусь добра ведаюць на "Бітве інтэлектаў" (як яшчэ называюць чэмпіянат) менавіта дзякуючы камандам БДУ, якія паказваюць сур'ёзны ўзровень падрыхтоўкі восьмы раз. З 1995/96 навуч. г., калі наш універсітэт упершыню ўдзельнічаў у гэтым спаборніцтве, нашы інтэлектуалы пабывалі ў Нідэрландах, Японіі, Кітаі, Чэхіі, Канадзе, тройчы – у ЗША і заўжды заставаліся сярод мацнейшых. У 2004 годзе каманда ФПМІ атрымала залаты медаль, а сёлетняя "бронза" дазволіла заняць годнае месца ў рэйтынгу найлепшых сусветных студэнцкіх зборных па праграмаванні.

Пра асаблівасці падрыхтоўкі да гэтых спаборніцтваў распавядае трэнер і кіраўнік каманды БДУ – доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Уладзімір Котаў: "Трэніроўка займае пяць гадзін, адбываецца 2–3 разы на тыдзень. Але сілы і час, ахвяраваныя студэнтамі, будуць узнагароджаныя добрымі вынікамі. Апрача гонару за перамогу і пашаны, якую атрымаюць дома, студэнты падчас чэмпіянату набываюць веды, дзелавую хватку і здольнасць пераносіць вялікія інтэлектуальныя нагрузкі – салідныя кампаніі зацікаўлены ў супрацоўніках, якія валодаюць такімі якасцямі. Яшчэ адзін стымул для плённых трэніровак – прызавыя, што сёлета складалі за першае месца 10 тыс. даляраў. Наша каманда атрымала прэмію ў 1050 даляраў. Не меней за грашовую падтрымку прыемна, што праз нашы намаганні Беларусь становіцца вядомая ў свеце і яе паважаюць. Неўзабаве пачнём рыхтавацца да першынства ФПМІ (красавік), якое вызначыць каманды, што выступяць на першынстве БДУ (верасень), дзе будуць вылучаныя ўдзельнікі наступнага чвэрцьфіналу чэмпіянату свету (кастрычнік), затым чакае паўфінал у Санкт-Пецярбургу і фінал у шведскім Стакгольме. Адпачываць няма калі".

Уражаннямі дзеляцца самі пераможцы. Павел Іржаўскі, IV курс: "Наша каманда была сфарміраваная паўтара гады таму. Мы ўдзельнічалі ў леташнім фінале, дзякуючы чаму адчувалі сябе ўпэўнена, не зважалі на дробязі – і дасягнулі неблагіх вынікаў". Мікіта Леснікаў, II курс: "Побач з асноўнымі трэніроўкамі мы ўдасканальвалі свае навыкі падчас міжнародных цэнтралізаваных спаборніцтваў па праграмаванні, якія часта праводзяцца на базе універсітэта. Уражанняў многа і ад самога чэмпіянату, і ад краіны, дзе пабываў упершыню, ад Ніягарскага вадаспаду. Мы былі самай маладой камандай – зазвычай на мерапрыемствы такога ўзроўню адпраўляюцца пяцікурснікі, магістранты і аспіранты". Уладзімір Керус, III курс: "На фінале чэмпіянату сустрэў знаёмых, з многімі, як з маскоўскай камандай, сябрую яшчэ з часоў школьных алімпіяд. Надалей планую браць удзел у асабістых спаборніцтвах, якіх хапае. Досвед, які застаецца пасля такіх выпрабаванняў, вельмі карысны. Прыкладам, кампанія IBM на правах спонсара давала на чэмпіянаце сваю рэкламу – яны зацікаўленыя ў тым, каб прыняць на працу гатовых спецыялістаў. Калі задацца мэтаю, мяркую, можна туды патрапіць".

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

# ВЫНІКІ ФІНАНСАВА–ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КОМПЛЕКСУ БДУ ЗА 2007 ГОД

## Са справаздачы прарэктара па эканоміцы і інвестыцыях Уладзіміра СПІРЫНА на пасяджэнні Вучонага савета 24 сакавіка 2008 г.

Белдзяржуніверсітэт з'яўляецца адзіным комплексам, у які ўваходзяць адукацыйныя, сацыяльна-культурныя, навукова-даследчыя, вытворчыя, адміністрацыйна-гаспадарчыя і іншыя структурныя падраздзяленні, а таксама унітарныя прадпрыемствы і ўстановы (далей – юрыдычныя асобы БДУ).

Сёння комплекс БДУ складаецца з 33-х юрыдычных асоб, з якіх 15 з'яўляюцца бюджэтнымі, 18 – гаспадарча-разліковымі. Сярод іх – 11 навучальна-адукацыйных і 8 навукова-даследчых устаноў, 13 унітарных прадпрыемстваў, а таксама Дырэкцыя будоўлі аб'ектаў. Акрамя таго, адна арганізацыя створана з удзелам БДУ – Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю "Радыё БДУ".

*Дыяграма 1. Доля навучэнцаў комплексу БДУ за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове ў 2007 годзе.*




На балансе БДУ на 1 студзеня 2008 г. знаходзілася 107 будынкаў і збудаванняў агульнай плошчай 326,2 тыс. кв. м. Усяго за комплексам БДУ замацавана 160 будынкаў і збудаванняў агульнай плошчай 345,7 тыс. кв. м.

Для абслугоўвання існуючых будынкаў і тых, якія ўзводзяцца, а таксама для размяшчэння вучэбных і спартыўна-аздараўленчых баз універсітэта аддадзены ў пастаяннае карыстанне 44 зямельныя ўчасткі агульнай плошчай 174,93 га, у тым ліку ў г. Мінску – 36 участкаў агульнай плошчай 44,63 га.

Юрыдычным асобам БДУ і філіялам БДУ перададзены ў бязвыплатнае карыстанне памяшканні універсітэта плошчай 58,4 тыс. кв. м, што складае 17,9 % ад агульнай плошчы будынкаў БДУ. На пачатак 2008 г. 9 юрыдычных асоб БДУ мелі запазычанасць па кампенсацыі Белдзяржуніверсітэту затрат на камунальныя паслугі і эксплуатацыйныя выдаткі за 2007 г. на агульную суму больш за 1,3 млрд руб.

Паводле заключаных дамоў на 1 студзеня 2008 г. у арэнду здадзена 7,6 тыс. кв. м не задзейнічаных у навучальным працэсе плошчаў універсітэта, што складае 2,3 % ад агульнай плошчы будынкаў БДУ.

### Колькасны склад работнікаў комплексу БДУ

У справаздачным перыядзе ў структуры комплексу БДУ працавала 9 063 работнікі, у тым ліку 1 309 знешніх сумяшчальнікаў. Непасрэдна ва універсітэце працавала 5 942 чалавекі, у тым ліку 716 знешніх сумяшчальнікаў.

У агульнай структуры комплексу БДУ на 1 студзеня 2008 г. прафесарска-выкладчыцкі склад (ПВС) налічваў 3 083 чалавекі (разам са знешнімі сумяшчальнікамі), у тым ліку непасрэдна па універсітэце – 2 490 (2 302 – штатныя супрацоўнікі).

Агульная колькасць навуковых работнікаў па комплексе БДУ склала 946 чалавек (разам са знешнімі сумяшчальнікамі), у тым ліку непасрэдна па універсітэце – 400 чалавек (261 – штатныя супрацоўнікі).

Колькасць вучэбна-дапаможнага персаналу па комплексе БДУ склала 1 105 чалавек, у тым ліку непасрэдна па універсітэце – 784 чалавекі.

Колькасць іншага персаналу ў цэлым па комплексе БДУ павялічылася на 146 чалавек і склала на 1 студзеня 2008 г. 2 744 чалавекі, у тым ліку па універсітэце – 1 569 чалавек.

Непасрэдна ва універсітэце ў 2007 г. згодна са штатным раскладам утрымлівалася 5 429,75 штатных адзінак, у тым ліку за кошт бюджэту – 4 322,75 адзінак, пазабюджэтных сродкаў – 1 107,0 адзінак.

### Адукацыйная дзейнасць

У 2007 г. сярэднегадавы кантынгент навучэнцаў па комплексе БДУ склаў 30 974 чалавекі, што на 4,5 % ніжэй за кантынгент 2006 г. (гл. табл. 1). Пры гэтым колькасць тых, хто навучаецца за кошт бюджэту, паменшылася на 404 чалавекі (2,9 %), а тых, хто навучаецца за кошт уласных сродкаў, –на 708 чалавек (3,9 %).

Суаднесенасць колькасці навучэнцаў (па ўсіх крытэрыях) на платнай аснове і за кошт бюджэтных сродкаў у 2007 г. паказаны на дыяграме 1.

На 1 студзеня 2008 г. колькасць студэнтаў БДУ ўсіх формаў і відаў навучання склала 21 971 чалавек, у тым ліку тых, хто навучаецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, – 11 561 чалавек, з іх 8 980 – на дзённай форме навучання, 2 366 – на завочнай, 215 – на ваенным факультэце; за кошт уласных сродкаў навучаецца 10 410 чалавек, з іх 7 507 – на дзённай форме навучання, 2 903 – на завочнай.

У 2007 г. колькасць студэнтаў, якія атрымоўваюць стыпендыю, склала 8 379 чалавек ці 93,3 % ад колькасці студэнтаў дзённай формы, з якіх вучэбную стыпендыю атрымоўваюць 8 153 чалавекі, іменную – 28, сацыяльную – 198.

Працэнт паспяховасці студэнтаў у сярэднім за 2007 г. склаў 91,7 %, што на 0,3 % больш за 2006 г.

*Табліца 1. Сярэднегадавы кантынгент навучэнцаў па комплексе БДУ ў 2006–2007 гг.*

| № п/п | Найменне | Комплекс БДУ (усяго) | | у тым ліку | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | бюджэт | | па-за бюджэтам | |
| | | 2006 | 2007 | 2006 | 2007 | 2006 | 2007 |
| 1 | Студэнты | 21 570 | 23 669 | 11 620 | 11 380 | 9 950 | 12 289 |
| 2 | Магістранты | 534 | 522 | 220 | 173 | 314 | 349 |
| 3 | Аспіранты | 767 | 729 | 739 | 660 | 28 | 69 |
| 4 | Дактаранты | 19 | 20 | 19 | 20 | - | - |
| 5 | Слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў | 3 658 | 2 239 | 324 | 279 | 3 334 | 1960 |
| 6 | Навучэнцы | 5 538 | 3 795 | 1 229 | 1 235 | 4 309 | 2560 |
| **Усяго кантынгенту** | | **32 086** | **30 974** | **14 151** | **13 747** | **17 935** | **17 227** |

### Сярэдні заробак па БДУ

Сярэдні заробак работнікаў БДУ ў 2007 г. склаў 826,8 тыс. руб., у тым ліку ПВС – 1 077,0 тыс. руб.

Узровень аплаты працы работнікаў БДУ перавысіў узровень аплаты працы работнікаў народнай гаспадаркі ў цэлым на 17,9 %, прамысловасці – на 5,9 %, галіны адукацыі – 51,8 %.

Сярэдні заробак ПВС у БДУ з'яўляецца большым чым у галіне адукацыі на 6,9 % (адпаведна – 1 077,0 тыс. руб. і 1 007,1 тыс. руб.).

### Даходы комплексу БДУ

Агульны аб'ём даходаў у 2007 г. склаў 256,0 млрд руб.

Удзельная вага сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці ў бюджэтным фінансаванні склала 29,1 % (у 2006 г. – 37,4 %).

Асноўныя крыніцы даходаў комплексу БДУ ў 2007 г.:

- грашовыя сродкі рэспубліканскага бюджэту – 145,7 млрд руб.;
- сродкі ад пазабюджэтнай дзейнасці – 42,4 мдрд руб.;
- выручка ад фінансава-гаспадарчай дзейнасці гаспадарча-разліковых арганізацый комплексу БДУ – 51,1 млрд руб.
- сродкі, атрыманыя па дамовах з галоўнымі выканаўцамі заданняў рэспубліканскіх НТП і асобных праектаў, што фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, – 16,5 млрд руб.;
- крэдыты – 269,0 млн руб.

*Табліца 2. Звесткі аб выручцы ад пазабюджэтнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ.*

| Найменне структурнага падраздзялення | Сума (млн руб.) |
|---|---|
| Комплекс БДУ у тым ліку: | 93 560,5 |
| БДУ (уключна з усімі бюджэтнымі ўстановамі, у тым ліку навучальнымі, і Дырэкцыяй аб'ектаў, якія будуюцца): платнае і кантрактнае навучанне, арэнда памяшканняў, паслугі спартыўна-аздараўленчага характару, аўтагаспадарка і інш. | 42 419,9 |
| навучальна-адукацыйныя ўстановы | 10 587,4 |
| унітарныя прадпрыемствы | 30 484,0 |
| прадпрыемствы, створаныя з удзелам БДУ | 3 029,0 |
| філіялы БДУ | 7 040,2 |

Даходы факультэтаў універсітэта ад аказання платных паслуг у 2007 г. склалі 17,7 млрд руб.

У 2007 г. за навучанне на кантрактнай аснове 595-ці замежных грамадзян было атрымана 1,1 млн долараў ЗША (у 2006 г. – 429 кантрактаў на суму 641,2 тыс. долараў ЗША).

Выручка ад пазабюджэтнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асоб БДУ і філіялаў БДУ па выніках 2007 г. склала 93,56 млрд руб. (прырост к 2006 году – 22,9 %).

Даходы комплексу БДУ па катэгорыях структурных падраздзяленняў паказаны на дыяграме 2 і ў табліцы 2.

*Дыяграма 2. Даходы комплексу БДУ ў разрэзе структурных падраздзяленняў.*




### Выдаткі комплексу БДУ

Агульныя фактычныя выдаткі бюджэтных прызначэнняў па комплексе БДУ ў 2007 г. склалі 140,3 млрд руб. (прырост к 2006 году – 13,2 %). У агульнай структуры бюджэтных прызначэнняў комплексу БДУ выдаткі на развіццё навучальных устаноў склалі 84,2 млрд руб. (60 % ад агульных выдаткаў), у тым ліку 80,0 млрд руб. – на арганізацыю навучальнага працэсу (57 %), навукова-даследчую работу – 15,3 млрд руб. (10,9 %), капітальнае будаўніцтва – 40,9 млрд руб. (29,1 %).

На непасрэднае ўтрыманне БДУ ў 2007 г. з рэспубліканскага бюджэту расходавана 76,4 млрд руб. (98 % ад зацверджанага плана). Найбольшую ўдзельную вагу ў агульным аб'ёме фінансавання займаюць выдаткі на заробак і налічэнні на заробак – 46,5 млрд руб. (60,9 %), выплату стыпендый – 17,5 млрд руб. (23,0 %), аплату камунальных паслуг – 3,8 млрд руб. (5 %), капітальны рамонт – 2,5 млрд руб. (3,2 %). Фактычныя выдаткі бюджэтных прызначэнняў БДУ ў 2007 г. па артыкулах выдаткаў склалі 73,6 млрд руб.

Расходы пазабюджэтных сродкаў бюджэтнымі арганізацыямі комплексу БДУ ў 2007 г. склалі 32,9 млрд руб., у тым ліку:

- заробак работнікаў і службоўцаў і налічэнні на заробак – 16,0 млрд руб.;
- капітальныя выдаткі – 4,7 млрд руб. (у тым ліку капітальны рамонт – 3,1 млрд руб);
- набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў – 2,7 млрд руб.;
- іншыя бягучыя выдаткі на закупку тавараў і аплату паслуг – 8,4 млрд руб.

### Фінансава-гаспадарчая дзейнасць гаспадарча-разліковых арганізацый комплексу БДУ

Сярэдняспісачная колькасць работнікаў (без знешніх сумяшчальнікаў) у 22-х гаспадарча-разліковых арганізацыях комплексу БДУ на 1 студзеня 2008 г. склала 1 051 чалавек (у 2006 г. – 940).

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі работ, паслуг у 2007 г. склала 51,1 млрд руб., у 2006 г. – 48,5 млрд руб. (рост – 5,4 %).

Да валаваўтваральных арганізацый па выручцы ад рэалізацыі тавараў, прадукцыі, работ, паслуг адносяцца:

- УП "Унікаштмет БДУ" (удзельная вага ў агульнай масе выручкі – 16,8 %);
- УП "КБСТ" БДУ (11,9 %);
- Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій (8,8 %);
- РУП "Камбінат грамадскага харчавання БДУ" (8,2 %);
- РУП "ИНКОС" БДУ (6,1 %);
- УП "Унітэхпром БДУ" (5,9 %).

Прыбытак ад рэалізацыі тавараў, прадукцыі, работ, паслуг склаў 5,95 млрд руб, у 2006 г. – 5,06 млрд руб. (рост – 17,4 %). Чысты прыбытак склаў 3,72 млрд руб., у 2006 г. – 3,17 млрд руб. (рост – 17,2 %). Рэнтабельнасць прадукцыі ў сярэднім па гаспадарча-разліковых арганізацыях комплексу БДУ ў 2007 г. склала 18,2 %, у 2006 г. – 15,7 % (рост – 2,5 %).

Непасрэдна унітарныя прадпрыемствы комплексу БДУ ў 2007 г. забяспечылі выкананне даведзеных планавых заданняў па асноўных паказальніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці. У лікавым выразе гэта выглядае наступным чынам:

- выручка ад рэалізацыі прадукцыі, паслуг – 29,62 млрд руб. (план – 27,69 млрд руб.);
- прыбытак ад рэалізацыі тавараў, прадукцыі, работ, паслуг - 2,61 млрд руб. (план – 2,31 млрд руб.);
- рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі – 11,4 % (план – 10,3 %).

Па выніках 2007 г. дэбітарская запазычанасць па прадпрыемствах комплексу БДУ ў 2007 г. склала 15,3 млрд руб., у 2006 г. – 11,2 млрд руб. (павелічэнне на 36,5 %). Крэдытарская запазычанасць узрасла ў параўнанні з 2006 г. на 62,3 % і склала 12,2 млрд руб.

У справаздачным годзе РУП "Адамас БДУ" не забяспечыла рэнтабельную працу і дапусціла страты ў памеры 655,0 млн руб.

### Капітальнае будаўніцтва. Капітальны і бягучы рамонт

У 2007 г. па аб'ектах будаўніцтва засвоена капітальных укладанняў на агульную суму 32,3 млрд руб., у тым ліку:

- будаўніцтва навукова-вучэбна-даследчага комплексу па вул. Кальварыйскай, 9 – 22,7 млрд руб.;
- будаўніцтва вучэбна-лабараторнага корпуса на Прывакзальнай плошчы – 9,6 млрд руб.

Планавыя прызначэнні на капітальны рамонт у 2007 г. склалі 6,6 млрд руб., прафінансавана – 8,1 млрд руб., што склала 122,7 % ад запланаванага.

Фінансаванне бягучага рамонту ў 2007 г. ажыццяўлялася са сродкаў рэспубліканскага бюджэту і пазабюджэтных сродкаў універсітэта. Усяго на мэты бягучага рамонту выдаткавана 1,2 млрд руб., у тым ліку 247,8 млн руб. за кошт пазабюджэтных сродкаў БДУ.

УНІВЕРСІТЭТ

ВІНШУЕМ!

# ДРУГАЯ МАЛАДОСЦЬ МЕХМАТА

***Сёлета механіка-матэматычны факультэт нашага універсітэта святкуе свой паўвекавы юбілей. Да гэтай даты мехмат падыйшоў на чале з маладым 45-гадовым дэканам прафесарам Міхаілам ЖУРАЎКОВЫМ, які заняў гэтую пасаду год таму.***

Па словах Міхаіла Анатольевіча, яшчэ ў школе ён вырашыў звязаць свой лёс з матэматыкай і механікай, якую лічыў найцікавейшым раздзелам фізікі. Аб існаванні спецыялізаванага факультэта даведаўся, калі прыехаў у Маскоўскі дзяржаўны універсітэт як удзельнік Усесаюзнай алімпіяды па матэматыцы. Юны Міхаіл Жураўкоў, не вагаючыся, запісаўся ў завочную школу мехмата МДУ, які ўжо на той час лічыўся адным з самых прэстыжных факультэтаў. Аднак паступаць вырашыў усё ж такі на аналагічны факультэт БДУ. І ні аб чым не шкадуе, паколькі тут сустрэў выдатных педагогаў і здолеў рэалізаваць сябе як выкладчык, навукоўца, а цяпер і як кіраўнік.

**– Міхаіл Анатольевіч, як Вы ацэньваеце сваю дзейнасць у якасці дэкана, і што змянілася за гэты год на факультэце?**

– Хваліць сябе нeяк нягожа, але пэўныя поспехі ёсць. Мы разгарнулі дзейнасць па некалькіх стратэгічных напрамках: праца з абітурыентамі; заахвочванне студэнтаў, аспірантаў, маладых выкладчыкаў; захаванне і развіццё навуковых школ і кадравага патэнцыялу. Гэтыя тры вектары натуральным чынам звязаны. Патлумачу чаму. Мы аднавілі савет маладых вучоных на факультэце, які арганізаваў работу рэгулярнага семінара, дзе выступаюць маладыя вучоныя не толькі нашай, але і іншых навучальных устаноў. Акрамя таго, ў лютым прайшоў выязны семінар на базе САК "Брыганціна" з удзелам гасцей з Вільнюса. Савет таксама актыўна павёў прафарыентацыйную работу. У нас больш за 10 падшэфных школ, у якіх выкладчыкі мехмата вядуць гурткі па матэматыцы. Мы актывізавалі працу і з Ліцэем БДУ, дзе выкладаюць многія нашыя супрацоўнікі. Акрамя таго, вядучыя навукоўцы факультэта па суботах бясплатна чытаюць для школьнікаў Мінска лекцыі, якія карыстаюцца неверагоднай папулярнасцю; па чацвяргах вядуць семінары па матэматыцы для выкладчыкаў сталічных школ. І ўсё на чыстым энтузіязме! Так што работа з абітурыентамі і маладымі навукоўцамі ў нас наладжана дастаткова добра.

З абнаўленнем кадраў пытанне больш складанае. Сярэдні ўзрост выкладчыкаў даволі салідны. Моладзь шукае больш прыбытковую працу. У гутарках з выпускнікамі я імкнуся данесці ідэю, што БДУ і, у прыватнасці, мехмат – гэта гарантыя іх высокай кваліфікацыі і прэстыжнага працаўладкавання. Таму заклікаю тварыць тут, а на фірмах падзарабляць кансультантамі, распрацоўшчыкамі і г.д. І да гэтых слоў прыслухоўваюцца. Наколькі я ведаю, з маладых, якім прапаноўваем працу на факультэце, пакуль ніхто не збіраецца сыходзіць. Больш таго, усе абароненыя сёлета аспіранты таксама засталіся на факультэце. Сённяшні мехмат – гэта брэнд. Спадзяюся, што моладзь стане тут працаваць з яшчэ большай цікавасцю. А запланаванае будаўніцтва маласямейнага інтэрната для супрацоўнікаў БДУ надасць гэтай перспектыве дадатковую прывабнасць.

**– У якой ступені студэнты мехмата ўцягнуты ў навукова-даследчую дзейнасць, і наколькі звязаны вучэбны працэс на факультэце з вытворчасцю?**

– Трэба ўлічваць, што матэматыка з'яўляецца чыстай навукай, значны працэнт выкладчыкаў і студэнтаў займаюцца фундаментальнымі даследаваннямі. Аднак жыццё паказвае, што яны могуць з поспехам выкарыстоўвацца на вытворчасці. Першапачаткова ўсе студэнты і абітурыенты хочуць стаць праграмістамі і пры гэтым маюць на ўвазе звычайнага кадзіроўшчыка. Да прыкладу, у ЗША спецыяльнасць кадзіроўшчыка атрымліваюць пасля каледжа. У нас жа – 5-гадовая падрыхтоўка, і выпускнікі павінны ўмець не толькі пісаць найпрацейшыя праграмы, але і будаваць матэматычныя мадэлі разнастайных складаных працэсаў і з'яў, а таксама распрацоўваць алгарытмы. А гэта, у сваю чаргу, патрабуе вельмі сур'ёзнай матэматычнай падрыхтоўкі. Адсюль да вытворчасці – прамы шлях. Так, на аддзяленні "Механіка" штогод выконваецца больш за 15–20 дагавораў з прадпрыемствамі машынабудавання, горназдабывальнай і нафтаперапрацоўчай галінамі. Ёсць прыкладныя дамовы і на іншых кафедрах. На факультэце (на кафедрах механікі і тэорыі функцый) дзейнічаюць дзве НДЛ, сёлета створана і студэнцкая НДЛ. У цэлым болей за 70 % студэнтаў вядуць прыкладныя навуковыя ці фундаментальныя даследаванні. Да таго ж, большасць маладых людзей, пачынаючы з III курса, ужо працуе на фірмах, то-бок непасрэдна займаецца вытворчай дзейнасцю. Пазней яны туды і размяркоўваюцца. Чаму б і не, калі паспяваюць у вучобе і імкнуцца сябе прафесійна зарэкамендаваць. У МДУ, напрыклад, студэнтам ці аспірантам мехмата фірмы даплачваюць спецыяльную стыпендыю за тое, каб яны ў іх працавалі.



**– Як бы Вы ахарактарызавалі сённяшняе пакаленне студэнтаў? У чым яны пераўзыходзяць і ў чым саступаюць тым, хто вучыўся 15–20 гадоў таму?**

– Агульныя рысы падобныя, але сённяшняя моладзь адрозніваецца большым прагматызмам. Да прыладу, калі раней загадчык кафедры ці дэкан прапаноўваў студэнту працу ў лабараторыі, то пытанне пра грошы свядома не ўздымалася. Гэта было прэстыжна. Цяпер жа студэнт адразу пацікавіцца прапанаваным заробкам. І нельга сказаць – добра гэта ці блага, а тым больш асуджаць. У сучасных рэаліях інакш паступіць складана, паколькі сёння веды – гэта рэальны прадукт на рынку працы, які студэнты жадаюць прадаць як мага даражэй, бо ад гэтага непасрэдна залежыць матэрыяльны стан у далейшым. Другі момант носіць адназначна негатыўнае адценне – гэта сціранне субардынацыі паміж прафесарам і студэнтам. І гэта шчыльна звязана з выхаваннем маладога чалавека. Калі ранейшы студэнт заходзіў у кабінет загадчыка кафедры з піетэтам і толькі з важкай прычыны, то зараз любы можа папросту зазірнуць штосьці запытаць, а то і выставіць патрабаванні. Могуць пазваніць па мабільным тэлефоне – і гэта лічыцца звычайным. Эгацэнтрызм – распаўсюджаная з'ява ў сучасным моладзевым асяроддзі. Я ж лічу, што пэўную мяжу пераходзіць нельга.

Яшчэ адна неадназначная рыса – рацыяналізм. Як правіла, студэнты на І–ІІ курсе вучацца добра, а затым паспяховасць зніжаецца. Гэта звязана з тым, што студэнт пачынае выбіральна падыходзіць да свайго навучання і займаецца толькі тымі прадметамі, якія яму сапраўды неабходныя для працы. Калі раней быў стымул атрымаць чырвоны дыплом, застацца ў навуцы, прасунуцца наперад, то цяпер прэвалюе жыццёвы разлік.

**– Наколькі запатрабаваны маладыя спецыялісты – выпускнікі мехмата на рынку працы, і як будзе выглядаць сітуацыя ў найбліжэйшай перспектыве?**

– Зараз рэальная запатрабаванасць прамысловасці ў ІТ-спецыялістах удвая пераўзыходзіць прапановы ўсіх ВНУ рэспублікі. Аднак трэба дакладна ўсведамляць, якія спецыялісты патрэбны і каму. Інфармацыйныя тэхналогіі – панятак даволі шырокі. Адныя шукаюць работніка, здольнага да разлікаў у бухгалтарскім пакеце, а іншыя – спецыяліста ў навукаёмістае прадпрыемства ці інстытут для распрацоўкі найскладанейшых праграм і выканання мадэлявання. З развіццём рэальнага сектара эканомікі запатрабаванасць ў спецыялістах універсітэцкага ўзору будзе ўзрастаць. У МДУ, напрыклад, студэнтаў мехмата "расхопліваюць" ледзьве не з першага курса. Яшчэ большы попыт на выпускнікоў і аспірантаў, таму што ў Маскве хапае сур'ёзных фірмаў, якія маюць патрэбу ў дыпламаваных і кваліфікаваных спецыялістах. Мяркую, што ў хуткім часе аналагічная тэндэнцыя дойдзе і да нас, прычым выяўляцца гэта будзе ў геаметрычнай прагрэсіі. Але нават сёння практычна ўсе студэнты прыносяць індывідуальныя заяўкі, якія мы, натуральна, імкнёмся разгледзець у першую чаргу. Як відаць, праблем з размеркаваннем студэнтаў няма, наадварот, трэба думаць, як задаволіць попыт, што ўвесь час расце. Дарэчы, сёлета мы крыху павялічваем набор абітурыентаў. Гэта звязана з падрыхтоўкай спецыялістаў для будучай АЭС дзе, акрамя фізікаў і хімікаў, патрэбны "механікі", якія ўмеюць мадэляваць прыродныя працэсы і выконваць дакладныя разлікі на трываласць атамных рэактараў.

Ёсць у нашых планах і адкрыццё новых цікавых спецыяльнасцяў. Напрыклад, зараз вельмі запатрабавана кампутарная геаметрыя – кірунак, звязаны з пабудовай трохмерных кампутарных мадэляў цел. Вялікія перспектывы і ў біямеханіцы, што займаецца мадэляваннем розных біямеханічных канструкцый, арганізмаў і г.д.

**– Ці склаўся, на Ваш погляд, асаблівы карпаратыўны дух на факультэце?**

– Безумоўна, ён існуе і паступова ўзмацняецца. Трэба ўлічваць нашу спецыфіку. Матэматыка – даволі індывідуальная навука, якая не патрабуе вялікіх памяшканняў ці абсталяваных лабараторый. Матэматыкі, у асноўным, працуюць паасобку або невялікімі групамі. Гэта, канешне, адбіваецца пэўным чынам на чалавеку, але ні ў якім разе не пераўтварае мехмат у супольнасць разрозненых індывідуалаў. Усе нашыя выпускнікі з гонарам называюць сябе "мехмацянамі", а гэта значыць – адносяць сябе да адзінага брацтва. На факультэце навучаюцца студэнты ўжо ў трэцім пакаленні, то-бок склаліся цэлыя дынастыі. Гатоўнасць выкладчыкаў дармова весці гурткі і чытаць лекцыі сведчыць аб тым, што большасць з іх неабыякава ставіцца да лёсу факультэта. Так што ў нас досыць аптымістычныя перспектывы і, як гаворыцца, упэўненасць у заўтрашнім дні. Спадзяюся, супольнае святкаванне юбілею факультэта яшчэ больш аб'яднае калектыў. Гэтую нагоду мы максімальна выкарыстаем для "раскручвання" мехмата. Ужо афармілі выдатныя стэнды, абнаўляем сайт, выдалі густоўны буклет. У рамках красавіцкіх дзён мехмата, прымеркаваных да 50-годдзя факультэта, прайшла канферэнцыя "Твой шлях у навуку" для школьнікаў з усёй Беларусі, а таксама сустрэча выпускнікоў, якая сабрала нашых былых студэнтаў нават з Амерыкі і Германіі. Другая частка юбілейных мерапрыемстваў мяркуецца ў лістападзе, калі адбудзецца Міжнародны кангрэс па матэматыцы. Мы дамовіліся з аргкамітэтам, што форум пройдзе пад эгідай "50 гадоў мехмату" і адзін дзень спецыяльна будзе прысвечаны факультэту. Да гэтай падзеі рыхтуецца таксама змястоўная кніга пра мехмат і яго навуковыя дасягненні.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

# ЮБІЛЕЙ КАФЕДРЫ ТЭОРЫІ ФУНКЦЫЙ

***Кафедра тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта святкуе 70-годдзе.***



Сваю гісторыю кафедра распачала 1 верасня 1938 г., калі была створаная кафедра матэматычнага аналізу. Яе першы загадчык – дацэнт М.У. Ламбін. Пасля кафедру ачольвалі І.М. Гельфанд і Ф.Д. Гахаў. У 1973 г. яна была перайменаваная ў кафедру тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу, якая ў 1975 г. падзялілася на дзве – кафедра тэорыі функцый і кафедра функцыянальнага аналізу. Загадчыкам першай стаў прафесар Э.І. Звяровіч. З 2002 г. ёю кіруе прафесар А.А. Кілбас.

На працягу 70-ці гадоў кафедра забяспечвала выкладанне асноўных дысцыплін "Матэматычны аналіз" і "Тэорыя функцый комплекснай пераменнай" для студэнтаў І–ІІІ курсаў, з 1993 г. – дысцыпліны "Інтэгральныя ўраўненні" для студэнтаў ІІІ курса аддзялення механікі. З 1966 г. чытаюцца спецыяльныя курсы ў рамках дысцыплін спецыялізацыі і прыродазнаўчых дысцыплін па асноўных навуковых кірунках даследаванняў супрацоўнікаў кафедры, а таксама па методыцы выкладання матэматыкі ў курсе сярэдняй і вышэйшай школы.

На кафедры ажыццяўляюцца навуковыя даследаванні па фундаментальных напрамках сучаснай матэматыкі: краявыя задачы тэорыі аналітычных функцый, асаблівыя інтэгральныя ўраўненні, дробавае вылічэнне, інтэгральныя пераўтварэнні, спецыяльныя функцыі, звычайныя дыферэнцыяльныя ўраўненні дробавага парадку, ураўненні ў прыватных дробавых вытворных, вейвлет-аналіз і яго дадаткі да задач тэорыі кампазітаў і медыцыны.

У вытокаў развіцця вышэйназваных галін матэматычнага аналізу стаяў акадэмік Ф.Д. Гахаў, які арганізаваў у верасні 1962 г. работу навуковага семінара на кафедры матэматычнага аналізу. Ён таксама з'яўляецца заснавальнікам сусветна вядомай беларускай школы па краявых задачах аналітычных функцый і асаблівых інтэгральных ураўненнях, якую цяпер узначальваюць прафесары Э.І. Звяровіч, А.А. Кілбас і дацэнт С.В. Рагозін.

З 1962 г. супрацоўнікамі, дактарантамі і аспірантамі кафедры былі абароненыя 9 доктарскіх і 70 кандыдацкіх дысертацый; выдадзена 17 манаграфій, 5 падручнікаў і курсаў лекцый і больш за 30 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца супрацоўнікі кафедры; апублікавана больш за 1000 артыкулаў у вядучых матэматычных часопісах Рэспублікі Беларусь, краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў і дальняга замежжа.

Сусветным прызнаннем дасягненняў навукоўцаў кафедры тэорыі функцый з'яўляецца паспяховае правядзенне ў Мінску на базе гэтай жа кафедры пяці міжнародных канферэнцый з 1996 па 2006 гг., у якіх удзельнічалі некалькі сотняў вучоных з розных краін свету.

21–22 красавіка ў БДУ адбудзецца міжнародная навуковая канферэнцыя "Сучасныя праблемы аналізу і дыферэнцыяльных ураўненняў". Акрамя таго, з 3 па 7 лістапада падчас правядзення Х Канферэнцыі матэматыкаў Беларусі супрацоўнікі і аспіранты кафедры выступяць з навуковымі дакладамі.

**Прафесар Анатоль КІЛБАС**

# О НЕКОТОРЫХ ВОПРОСАХ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

## ПОСТАНОВЛЕНИЕ СОВЕТА МИНИСТРОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ 18 января 2008 г. № 68

В соответствии со статьей 32 Закона Республики Беларусь от 29 октября 1991 года "Об образовании" и статьями 9, 19, 21 и 38 Закона Республики Беларусь от 11 июля 2007 года "О высшем образовании" Совет Министров Республики Беларусь ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Утвердить прилагаемые:

Положение о первой ступени высшего образования;

Положение о второй ступени высшего образования (магистратуре);

правила приема в магистратуру высших учебных заведений;

Положение о высшем учебном заведении;

Положение о порядке подтверждения эквивалентности документов об образовании, признании и установлении соответствия периодов обучения и курсов высшего образования, а также подтверждения степеней высшего образования Республики Беларусь и других государств.

2. Признать утратившими силу:

постановление Совета Министров Республики Беларусь от 24 мая 2001 г. № 758 "О подготовке специалистов с высшим образованием" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2001 г., № 53, 5/6062);

постановление Совета Министров Республики Беларусь от 14 октября 2002 г. № 1419 "Об утверждении Положения о ступенях высшего образования" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., № 118, 5/11303);

постановление Совета Министров Республики Беларусь от 24 мая 2004 г. № 605 "Об утверждении Концепции внедрения двухступенчатой системы подготовки специалистов с высшим образованием в Республике Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., № 87, 5/14301).

3. Настоящее постановление вступает в силу со дня его официального опубликования.

**Премьер-министр Республики Беларусь С.Сидорский**

### ПОЛОЖЕНИЕ О ПЕРВОЙ СТУПЕНИ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

1. Настоящее Положение разработано в соответствии со статьей 32 Закона Республики Беларусь от 29 октября 1991 года "Об образовании" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., № 33, ст. 598; Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., № 37, 2/844) и Законом Республики Беларусь от 11 июля 2007 года "О высшем образовании" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № 171, 2/1349), и в нем регулируются осуществление подготовки специалистов на первой ступени высшего образования в высших учебных заведениях Республики Беларусь независимо от их формы собственности и подчиненности (далее – первая ступень), а также порядок и условия создания в высших учебных заведениях белорусскоязычных и русскоязычных групп (потоков).

2. Первая ступень обеспечивает подготовку специалистов с высшим образованием, обладающих фундаментальными и специальными знаниями и навыками.

3. Подготовку на первой ступени могут получать лица, имеющие общее среднее образование, профессионально-техническое образование с общим средним образованием либо среднее специальное образование, а также лица, желающие получить второе и последующее высшее образование.

4. Особенности подготовки кадров для Вооруженных Сил Республики Беларусь, других войск и воинских формирований Республики Беларусь, органов внутренних дел, органов и подразделений по чрезвычайным ситуациям на первой ступени определяются настоящим Положением и иными актами законодательства Республики Беларусь.

5. Подготовка на первой ступени может осуществляться в очной (дневной, вечерней) или заочной (в том числе дистанционной) форме получения высшего образования. По отдельным специальностям, перечень которых определяется законодательством Республики Беларусь, не допускается обучение в вечерней и заочной формах получения высшего образования.

6. Срок обучения на первой ступени в дневной форме получения высшего образования составляет от четырех до пяти лет.

Срок обучения на первой ступени по наиболее сложным специальностям, перечень которых утверждается в установленном порядке, может быть увеличен не более чем на один год.

**Шведскі інстытут.** Арганізацыя, што каардынуе міжнароднае супрацоўніцтва Швецыі ў галіне культуры, навукі і адукацыі. Фінансуе стыпендыяльныя праграмы ў сферы вышэйшай адукацыі на англійскай мове: летнія школы, навучанне ў магістратуры і аспірантуры, навукова-даследчыя стажыроўкі і праекты. Забяспечваюцца выдаткі на праезд, медыцынскае страхаванне, выплачваецца стыпендыя.

*www.si.se, www.studyinsweden.se*

**FCO Chevening.** Навучанне па праграмах магістратуры ва ўніверсітэтах Вялікабрытаніі (Оксфард, Уорык, Манчэстэр, Сасэкс). Розныя спецыяльнасці прыродазнаўчага і гуманітарнага кірункаў, якія вызначаюцца самастойна кожным універсітэтам. Поўнае забеспячэнне ўсіх выдаткаў на навучанне.

*www.ox.ac.uk, www.warwick.ac.uk, www.man.ac.uk, www.sussex.ac.uk*

**Эразмус Мундус (Erasmus Mundus).** Праграма вышэйшай адукацыі, што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам. Праграма дзейнічае з 2004 г. і прапануе розныя магістэрскія курсы на англійскай мове ў еўрапейскіх універсітэтах.

*http://europa.eu.int*

Новая ініцыятыва праграмы **"Магчымасці знешняга супрацоўніцтва" (Erasmus Mundus "External Cooperation Window)** абвешчана ў канцы 2006 года і накіравана на далейшае развіццё супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі паміж Еўрапейскім Саюзам і краінамі "трэцяга свету" за кошт рэалізацыі новых схем мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў. У праграме могуць удзельнічаць студэнты ўсіх ступеняў адукацыі і выкладчыкі згодна пераліку спецыяльнасцяў. Каардынацыю праграмы для Беларусі ажыццяўляе універсітэт Дэуста (г. Більбао, Іспанія).

*www.relint.deusto.es*

**IAESTE** (*www.iaeste.org*) – **Асацыяцыя па абмену студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцяў** – незалежная, непалітычная арганізацыя, куды ўваходзяць 80 краін свету. IAESTE дае магчымасць студэнтам III–IV курсаў, навучанне якіх звязана з тэхнічнымі навукамі, фізікай, хіміяй, інфарматыкай, а таксама біялогіяй, экалогіяй, фармацэўтыкай, сельскай гаспадаркай і іншымі спецыяльнасцямі, прайсці стажыроўку за мяжой працягласцю ад 1-го да 4-х месяцаў у перыяд з мая па верасень.

Штогод да снежня прыродазнаўчыя факультэты БДУ накіроўваюць прапановы па арганізацыі стажыровак для замежных грамадзян і спісы студэнтаў БДУ, якія рэкамендуюцца для практыкі за мяжой. Заявы падаюцца ў Нацыянальны камітэт Беларусі, які на штогадовай канферэнцыі краін-удзельніц абменьваецца прапановамі з партнёрамі і затым размяркоўвае іх па беларускіх ВНУ. Колькасць удзельнікаў праграмы з боку БДУ залежыць ад якасці пададзеных прапаноў і вынікаў канферэнцыі.

У маі бягучага года на серверы БДУ плануецца адкрыццё сайта па пытаннях акадэмічнай мабільнасці. Сачыце за навінамі!

**Вольга КАРАПЕЦЯН,**
**начальнік аддзела ўпраўлення міжнародных сувязяў**

# ВЫБІРАЙЦЕ З РОЗУМАМ!

Сучасная адукацыя актыўна расхінае свае межы. Міжуніверсітэцкае партнёрства і студэнцкія кантакты становяцца ўсё больш інтэнсіўнымі. Разам з тым, з пашырэннем магчымасцяў навучання за мяжой побач з ініцыятывамі, прызванымі ўдасканальваць прафесійныя якасці будучых спецыялістаў, садзейнічаць узаемакарыснаму супрацоўніцтву і развіццю міжкультурных сувязяў, усё часцей сталі з'яўляцца розныя праграмы, скіраваныя на радыкальную палітызацыю моладзі і ўцягнне яе ў проціпраўную дзейнасць. Пра ніякую адукацыю ў класічным яе разуменні, абагачэнне новымі навуковымі ведамі ці развіццё новых сяброўскіх міжнацыянальных адносін размова тут не ідзе.

Прывабнасць гэткіх семінарскіх заняткаў, летніх школ і іншых падобных праектаў для студэнтаў заключаецца ў "бясплатнасці" іх правядзення, калі ўсе арганізацыйныя выдаткі, звязаныя з праездам, пражываннем і харчаваннем, ажыццяўляюцца за кошт прымаючага бока. Пры гэтым рэкламуецца гарантыя ўсебаковых нефармальных "сяброўскіх" стасункаў на мерапрыемстве, адсутнасць якіх-небудзь небяспечных вынікаў для яго ўдзельнікаў. Але, як вядома, бясплатны сыр бывае толькі ў мышалоўцы.

Варта памятаць, што ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам выезды студэнтаў за мяжу неабходна ўзгадняць з Міністэрствам адукацыі нашай рэспублікі. Аднак асобныя студэнты, якія вырашылі паўдзельнічаць у сумнiўных мерапрыемствах, імкнуцца пазбегнуць згаданай працэдуры і адпраўляюцца за мяжу без адпаведнага дазволу кіраўніцтва факультэта і адміністрацыі ВНУ, а гэта непазбежна суправаджаецца несанкцыянаванымі пропускамі вучэбных заняткаў. Такія неабдуманыя дзеянні "прагульшчыкаў" могуць насіць і проціпраўны характар, паколькі часта спалучаюцца з фальсіфікацыяй дакументаў, што цягне ўжо за сабою не толькі дысцыплінарнае, але і адміністрацыйнае, а часам і крымінальнае пакаранне.

Яскравы прыклад таму – выпадак са студэнткай аднаго з факультэтаў БДУ, жаданне якой паўдзельнічаць у палітызаваным семінары за мяжой было настолькі вялікім, што яна выкарыстала падложную медыцынскую даведку ў якасці апраўдання пропуску заняткаў. У выніку ўрач, які выдаў заведама фальшывы дакумент, і маці дзяўчыны, якая ўсё гэта арганізавала, атрымалі ўмоўныя тэрміны. Акрамя таго, кожны з удзельнікаў гэтай афёры заплаціў вялікі штраф.

Думаецца, высновы тут напрошваюцца самі сабою. Маладым людзям трэба быць больш абачлівымі і ўважліва адносіцца да замежных праектаў і семінараў, якія ім прапануюцца, і ўзгадняць свой выезд з кіраўніцтвам факультэта. Па гэтым пытанні вы заўсёды можаце звярнуцца ва ўпраўленне міжнародных сувязяў, дзе вам дадуць неабходную кансультацыю.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення міжнародных сувязяў**

# ПАШЫРЭННЕ КРУГАГЛЯДУ

***Натуральна, стажыроўкі за мяжой насычаюць студэнтаў новымі ўражаннямі, ведамі, і нават спрыяюць з'яўленню новых планаў у прафесійнай дзейнасці. Гэта пацвердзілі маладыя ўдзельнікі розных міжнародных праграм.***



**Васіль Бумага, студэнт IV курса эканамічнага факультэта:**

– Па абмену першы семестр гэтага навучальнага года я правёў у Рурскім універсітэце, што ў Бохуме. Асаблівы інтарэс выклікала сістэма адукацыі Германіі. Кожны студэнт сам вырашае, якія прадметы ён будзе вывучаць і ў якой паслядоўнасці. Такім чынам, ён кожны семестр трапляе ў новую студэнцкую групу, якая засяроджваецца на вывучэнні пэўнага прадмета. Студэнтаў амаль ніхто не кантралюе, аднак на лекцыі яны ходзяць абавязкова, бо гэта патрэбна, найперш, ім самім. Я, напрыклад, абраў статыстыку, рынкі і прадпрыемствы, маркетынг, нямецкую мову. Дзякуючы такой прадметнай скіраванасці я здолеў атрымаць грунтоўныя веды.

Наконт адпачынку прыкмецiў, што нямецкія студэнты любяць разнастайна бавіць час. Агульнафакультэцкія дыскатэкі і святы ладзяцца практычна кожны тыдзень, што вельмі цікава.

**Вольга Аўсеенка, студэнтка IV курса факультэта міжнародных адносін:**

– Я навучалася ў Пекінскім універсітэце лінгвістыкі і культуры. Праслухала курс лекцый па эканамічнай кітайскай мове, па мове тамтэйшых СМІ, кітайскім кінамастацтве, літаратуры, геаграфіі. Асаблівых адрозненняў у сістэмах адукацыі не заўважыла. Аднак абітурыенты ямчэ перад паступленнем ў ВНУ ўжо маюць уяўленне, дзе потым выкарыстаюць свае веды. Гэта загадзя вырашае праблему працаўладкавання. Навучанне ва універсітэце адбываецца па ўзрастальнай. Больш складана вучыцца не на першым курсе, а на апошнім.

Мяне зацікавіў культуралагічны аспект. У Кітаі ўсё прасякнута непадробленым духам патрыятызму, які пакоіцца на трох галоўных каштоўнасцях – сям'я, адукацыя, поспех. Любое самейнае свята – абавязак. Адзінае дзіця, якому бацькі аддаюць усе свае пачуцці і сілы, пачынаюць вучыць ужо з трох гадоў і прарочаць толькі вялікую будучыню. Кітайская моладзь апошнім часам усё больш скіроўвае свае позіркі ў бок Еўропы і заходняй культуры. Аднак усе нацыянальныя традыцыі таксама імі шануюцца. Мне, як будучаму лінгвакраіназнаўцу, было карысна пажыць ў краіне, мову якой я пачала вывучаць на радзіме.

**Кацярына Скрыган, магістрантка біялагічнага факультэта БДУ:**

– Я прайшла стажыроўку ў Германіі. Там адчувала сябе ўпэўнена і ў працэсе вывучэння цэлага шэрагу дысцыплін, і падчас размоў з выкладчыкамі на навукова-біялагічныя тэмы шырокага профілю. Справа ў тым, што на нашым факультэце вельмі моцная тэарэтычная падрыхтоўка. Аднак там больш увагі надаецца практыцы. І паколькі я мела ўяўленне аб тэарэтычнай падаплёцы вопытаў і эксперыментаў, мне было няцяжка асвоіць нямецкія практычныя методыкі. Я прайшла шырокі лабараторны практыкум па такіх дысцыплінах, як мікрабіялогія, біятэхналогіі, праграмаванне. І сёння, будучы магістранткай, я праўжу ўласныя навуковыя даследаванні ў галіне малекулярнай генетыкі раслін.

**Гутарыла Ганна ЛАГУН**

УНІВЕРСІТЭТ

## СВЯТКАВАННІ

***Прынята лічыць, што ў 10 год у дзіцяці заканчваецца перыяд ранняга дзяцінства, у галаве з'яўляюцца першыя думкі аб сэнсе жыцця...***

# СТУДСАЮЗУ – 10+1!

Студсаюз як дзіця. Летась ён адзначыў 10-гадовы юбілей, які прымусіў звярнуцца да асэнсавання дзейнасці арганізацыі. Узяць хаця б мінулы год, які быў вельмі багатым на розныя падзеі: старастат, Капуснік БДУ, Зімовая школа журналістыкі... Цяжка пералічыць усе мерапрыемствы і праекты, здзейсненыя з дапамогай Студсаюза. Арганізацыя гучна заявіла пра сябе, ды так, што некаторыя нават паспелі папракнуць у залішняй пафаснасці (а гэта ж толькі на карысць!).

Святкаванне чарговага дня нараджэння Студсаюза прайшло маштабна і цікава. 25 сакавіка мноства студэнтаў сабралася ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ, дзе пры падтрымцы кампаніі "МТС" быў арганізаваны цудоўны канцэрт. На пачатку мерапрыемства найбольш папулярным быў вокліч: "Без білета! Без білета!" І не падумайце, што камусьці не хапіла месца – проста хэдлайнерам канцэрта была вядомая група "beZbileta". Акрамя яе, публіку пацешыла група "ЙоЙо", якая нядаўна выпусціла свой першы альбом.

Уся каманда Студсаюза прысутнічала ў зале і радасна прымала віншаванні, скандуючы "Студсаюз!!!". Пасля такога святкавання жаданне працаваць яшчэ больш узрастае. Жадаем няўрымслівым актывістам не зніжаць тэмп, ствараць новыя праекты і працягваць старыя, "крэатывіць" і "пазітывіць", рабіць наша студэнцкае жыццё ярчэйшым і цікавейшым. З днём нараджэння, Студсаюз!!!

**Люба ЛЕАНОВІЧ**

## НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# "АД ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ ЧЫСТАЙ ВАДЫ ДА СТАГОДДЗЯ ЗДАРОВАГА ЖЫЦЦЯ"

***Моладзевы адукацыйны форум пад такой незвычайнай назвай прайшоў 26 сакавіка ў нашым універсітэце па ініцыятыве хімічнага факультэта. Інфармацыйную і фінансавую падтрымку ў правядзенні мерапрыемства аказала Прадстаўніцтва ААН у Беларусі.***

Форум быў праведзены ў межах Міжнароднага дзесяцігоддзя дзеянняў "Вада для жыцця", аб'яўленага ААН у 2005–2015 гадах, і прымеркаваны да Сусветнага дня водных рэсурсаў, які адзначаецца 22 сакавіка. Па словах арганізатараў, галоўная задача навуковай сустрэчы – павысіць узровень інфармаванасці студэнтаў па пытаннях забруджвання і аховы водных рэсурсаў. Удзельнікаў з розных галін навукі – медыцыны, біялогіі, хіміі і геаграфіі – на час правядзення форуму з'ядналі актуальныя тэмы ачысткі і рацыянальнага выкарыстання вады. З уступным словам звярнуўся да ўдзельнікаў прарэктар па навуковай працы БДУ прафесар Уладзімір Панькоў. З дакладамі выступілі члены-карэспандэнты Акадэміі навук прафесар Аляксандр Астапеня і прафесар Анатоль Кудзельскі, а таксама прафесар Дзмітрый Грыншпан, намеснік дэкана хімічнага факультэта, кандыдат хімічных навук Таццяна Савіцкая і іншыя вядучыя спецыялісты рэспублікі. Свае навуковыя даследаванні прадставілі і студэнты. Тэмы больш чым проста цікавыя: "Ці правільна мы распараджаемся вадой?", "Якасць прэсных падземных вод Беларусі", "Чыстая вада – як гэтага дабіцца?". Зварот хімічнай супольнасці да праблем ачысткі вады невыпадковы. Сваёй паспяховай ініцыятывай хімфак БДУ ўжо не ў першы раз даказаў, што хімікі могуць не толькі забруджваць ваду, але і распрацоўваць новыя спосабы яе ачысткі. На форуме былі прадэманстраваныя метады і тэхналогіі па ачыстцы павярхоўных, падземных і сцёкавых вод. Арганізатары спадзяюцца, што форум дапамог звярнуць увагу грамадства на праблему чыстай вады ў нашай краіне. Працяг будзе ў наступным годзе. Мяркуецца, што чарговае мерапрыемства набудзе статус міжнароднага.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

## ШКОЛА АКТЫВУ

# МАСТАЦТВА КІРАВАЦЬ УРАЖАННЕМ

***У рамках студэнцкай бізнэс-канферэнцыі "Бізнэс, развіццё, інфармацыя, веды" (кіраўнік праекта – Алена Галяка) 5 красавіка прайшоў чарговы семінар-практыкум пад назвай "Стварэнне асабістага брэнда". Удзельнікі гэтага мерапрыемства займаліся самааналізам і фарміраваннем уласнага іміджу.***



Праграма складалася з наступных частак: "Эфектыўнае сумоўе", "Стварэнне асабістага брэнда" і "Асобавыя асаблівасці". Першую з іх правяла кіраўнік па пошуку, развіцці і падборы персаналу ТАА "Першая Кансалтынгавая" Таццяна Яцкевіч. Працытаваўшы Гофмана: "Імідж – гэта мастацтва кіраваць уражаннем", яна падкрэсліла важнасць першага ўражання на суразмоўцу, а ў гэтым 93 % належыць паводзінам і знешняму выгляду і толькі каля 7 % – маўленню чалавека. Таццяна Яцкевіч дала некалькі слушных парад пры працаўладкаванні і звярнула ўвагу на падрыхтоўку да размовы з магчымым работадаўцам.

У другой частцы семінара выпускніца БДУ, а зараз супрацоўнік Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта РБ Ксенія Абрамава распавяла пра фарміраванне ўласнай асобы. На яе думку, для дасягнення поспеху неабходна самаразвіццё ў розных кірунках і імкненне да індывідуальнасці. Творчасць, крэатыў, неардынарнасць мыслення... Без іх таксама нікуды! А яшчэ трэба самастойна ставіць задачы і вырашаць іх. Гэтаму спрыяе ўдзел у арганізацыях студэнцкага самакіравання, да чаго спрычынілася ў свой час і сама дакладчыца.

Апошняя ж частка семінара была прысвечаная асаблівасцям кожнага "Я". Разабрацца з імі ўдзельнікам канферэнцыі дапамагла Лідзія Вечар – вядучы спецыяліст у сферы іміджу. Паводле яе, вялікую ролю ў стварэнні ўласнага вобраза іграе добрае веданне самога сябе. Гэта надае ўпэўненасць і псіхалагічную ўстойлівасць пры вядзенні дзелавой гутаркі. Галоўнае – сачыць за ўласным стылем і манерамі, а не падладжвацца пад суразмоўцу. Гэтая тэма выклікала ажыятаж, таму Лідзія Сцяпанаўна напрыканцы параіла дадатковую літаратуру для самастойнага вывучэння.

Усе ўдзельнікі бізнэс-канферэнцыі атрымалі адпаведныя сертыфікаты і самае галоўнае – карысны досвед, які дапаможа паспяхова скончыць універсітэт і знайсці сабе годнае месца працы.

**Вераніка БУТА**

**Фота Любы ЛЕАНОВІЧ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Бронзавы медаль каманды БДУ на Чэмпіянаце свету па праграмаванні** – БелТА, БелаПАН, tut.by (10.04); bdg.by (11.04); naviny.by (11.04); "Звязда" (11.04); "Вечерний Минск" (11.04); "Настаўніцкая газета" (17.04).

**Прафесійна-псіхалагічнае сумоўе ў БДУ** – БелТа (01.04; 05.04; 07.04); "Рэспубліка" ("Ваша мотивация – наша рекомендация", 01.04); "Народная газета" ("Иди и говори", 01.04; "Приходите, поговорим", 04.04; "Знать мотив, найти слова", 08.04; "Абитуриенты стали серьезнее", 15.04); "Звязда" ("Прафесійны адбор: пакуль «адсеяліся» толькі адзінкі", 08.04); "СБ – Беларусь сегодня" ("Куда пойти учиться?", 08.04); "Настаўніцкая газета" ("У БДУ не атрымалі рэкамендацыі ўсяго пяць чалавек", 08.04); "Минский курьер" (03.04); "Комсомольская правда в Белоруссии" ("У меня спросили, как работает БРСМ", 08.04; "Завалить собеседование на журфак БГУ практически невозможно", 15.04); "Вечерний Минск" (08.04); БелаПАН (07.04), naviny.by ("В первый день спецсобеседование в БГУ не прошли пять человек", 07.04); tut.by (07.04; 08.04).

**Выстава-кірмаш "Каменая казка"** – "Минский курьер" ("«Каменная сказка» ко Дню геолога", 02.04); "Звязда" ("«Каменая казка» зноў у Мінску", 04.04).

**Сустрэча з пісьменнікамі на філфаку БДУ з нагоды 30-годдзя з часу выхаду калектыўнага зборніка "Вёсны"** – "ЛіМ" ("Вёсны сабралі на свята", 04.04).

**Моладзевы адукацыйны форум "Ад дзесяцігоддзя чыстай вады – да стагоддзя здаровага жыцця", які адбыўся на хімфаку БДУ** – "Рэспубліка" ("С форума – с «домашним заданием»", 04.04).

**Выстава студэнткі геафака БДУ Саак Антанесян у Барысаўскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы** – "Обозреватель" ("Мост между Беларусью и Арменией", 04.04).

**"Свірыдаўскія чытанні "** – БелТА (05.04); "Рэспубліка" ("Взрыв научной мысли", 08.04).

**Пра новы кірунак у падрыхтоўцы спецыялістаў – вэб-журналістыку, які адкрываецца з новага навучальнага года на журфаку БДУ** – naviny.by ("Журфак БГУ будет готовить акул виртуального пера", 07.04).

**Інтэрв'ю са студэнткай ФФСН БДУ – стыпендыятам Спецфонду Прэзідэнта краіны Маргарытай Фабрыкант** – "Маладосць", №3 ("Памяркоўнасць беларуса – міф або рэальнасць?").

**Пра хімічны факультэт БДУ, заданні па хіміі і біялогіі для паступлення ў Ліцэй БДУ** – "Рэпетитор", №4.

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НЕ ПРАМІНІЦЕ!

***Аддзел па справах Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінскага аблвыканкама абвяшчае конкурс аўтарскіх праектаў "ІНФАРМАЦЫЙНЫ МОЛАДЗЕВЫ ПАРТАЛ МІНШЧЫНЫ".***

Конкурсныя намінацыі – лепшы вэб-дызайн, лепшая праграмная рэалізацыя, лепшая PR-канцэпцыя. Удзел у конкурсе могуць браць маладыя людзі ва ўзросце да 31-го года. Пераможцаў чакаюць грашовыя прызы і каштоўныя падарункі. Заяўкі на ўдзел і конкурсныя праекты прымаюцца да 17 мая 2008 г. Адзін конкурсны праект можа быць заяўлены ў некалькіх намінацыях. Прымаюцца таксама і камандныя праекты. Больш падрабязную інфармацыю чытайце на сайтах:

*www.pacademy.edu.by*

*www.minsk-region.gov.by*

Наш адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, д.13; тэл: (017) 226-45-43.

***Увага! Супрацоўнікі БДУ запрашаюцца да ўдзелу ў праграме транснацыянальнага супрацоўніцтва Еўрапейскага Саюза "Рэгіён Балтыйскага мора 2007–2013".***

У рамках гэтай праграмы рэалізацыя сумесных партнёрскіх праектаў транснацыянальнага супрацоўніцтва фінансуецца са сродкаў ЕС, якія накіраваны на садзейнічанне сацыяльна-эканамічнаму развіццю і павышэнню канкурэнтаздольнасці краін і тэрыторый рэгіёна, у які ўваходзіць і Рэспубліка Беларусь. Разглядаюцца праекты па наступных тэматычных галінах:

1) падтрымка інавацый;

2) знешняя і ўнутраная даступнасць рэгіёна Балтыйскага мора (транспарт і інфармацыйныя тэхналогіі);

3) кіраванне Балтыйскім морам як агульным рэсурсам;

4) садзейнічанне прывабнасці і канкурэнтаздольнасці гарадоў і рэгіёнаў.

У рамках праектаў падтрымліваюцца: падрыхтоўка стратэгій, планаў дзеянняў і методык, тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў, абмен станоўчым досведам, прапановы па інвеставанні і прамыя інвестыцыі. Праектныя прапановы, што атрымаюць перамогу, будуць фінансавацца са сродкаў Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства ЕС. Памер фінансавання для партнёраў з Расіі і Беларусі складзе да 90 % ад кошту запланаваных праектных мерапрыемстваў.

Супрацоўнікі БДУ, якія зацікавіліся праграмай, могуць звяртацца па дадатковую інфармацыю ў аддзел навукова-інавацыйнай дзейнасці (тэл. 209-52-39, Сахарук Сяргей Адамавіч). Тэрмін падачы праектаў – да 30 мая 2008 г.

Электронны адрас праграмы "Рэгіён Балтыйскага мора 2007–2013": *http://eu.baltic.net*

## АБ'ЯВЫ

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ вылічальнай матэматыкі,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, філасофіі культуры;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэорыі функцый, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў, тэхналогіі праграмавання, батанікі, мікрабіялогіі, заалогіі, гісторыі новага і найноўшага часу, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, сацыяльнай камунікацыі, замежнай журналістыкі і літаратуры, сацыялогіі журналістыкі, прыкладной лінгвістыкі, сучаснай беларускай мовы, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, філасофіі і метадалогіі навукі, сацыяльнай камунікацыі, замежнай журналістыкі і літаратуры, тэхналогій камунікацыі, фізічнага выхавання і спорту, нямецкай мовы, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, рускай літаратуры, замежнай літаратуры, англійскага мовазнаўства;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: філасофіі культуры, псіхалогіі, сацыялогіі журналістыкі, тэхналогій камунікацыі, нямецкага мовазнаўства;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяхіміі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, вылічальнай матэматыкі, матэматычнага забеспячэння АСК, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, тэхналогіі праграмавання.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ кіравання фінансамі і маёмасцю;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры кіравання фінансамі і маёмасцю.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў; тэл. 210-01-10.**

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

ВЯДУЧАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 02.00.02 "Арганічная хімія";

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.05 "Оптыка";

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.01 "Прылады і метады эксперыментальнай фізікі";

МАЛОДШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.13.11 "Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і кампутарных сетак".

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220096, г. Мінск, вул. Курчатава, 7; тэл. 212-48-43.**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# КАЛІ Ў СЭРЦЫ ВЯСНА…

***Літаратурна-музычны канцэрт пад такой назвай адбыўся 1 красавіка на юрыдычным факультэце, дзе выступілі таленавітыя юнакі з усіх факультэтаў БДУ.***

Сапраўды, што рабіць, калі падчас вучобы ў грудзях з'яўляецца незвычайнае пачуццё – цёплае, прыемнае. Губляецца цікавасць да лекцыі, думкі адлятаюць далёка ад аўдыторыі… Растлумачыць такі настрой проста: прыйшла вясна. Незвычайная пара, якая натхняе і абуджае. Згадзіцеся, адразу ж з'яўляецца жаданне зрабіць нешта прыемнае для людзей. Напрыклад, пачытаць вершы, прадэманстраваць свае артыстычныя ці вакальныя здольнасці.

Саюз жанчын БДУ заўсёды ахвотна ідзе насустрач такому ўзнёсламу настрою і ладзіць цудоўную літаратурна-музычную імпрэзу, чыёй "душой" з'яўляецца Валянціна Бранавец. Акрамя выдатнага валодання законам, яна спазнала чароўны свет мастацтва і прапануе яго ўсяму творчаму люду.

Жаданне ўсхваліць вясну аб'яднала студэнтаў і выкладчыкаў розных факультэтаў.



На вечарыне былі прадстаўлены розныя нумары: танцы (тут сябе выдатна праявіў калектыў з ФМА са страсным танга і танцам с капелюшамі); песні (складана вызначыць найлепшага, бо ўсе выступоўцы паказалі сваё эстраднае майстэрства). Але найбольш уразілі слухачоў аўтарскія вершы студэнтаў. Неверагодна, як фізікі альбо хімікі, якія "завісаюць" у лабараторыях, маглі напісаць такія кранальныя творы?



Атрымліваецца, сапраўдны талент і прагу да мастацтва не магчыма знішчыць складанымі формуламі і прабіркамі. "Любите жизнь, да так, чтобы она вас полюбила". Над гэтымі радкамі трэба задумацца, і не толькі таму, што на двары вясна, але дзеля таго, каб вясна заўсёды была ў нашых сэрцах.

Лейла ІСМАІЛАВА

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

***3–4 красавіка ў Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ прайшлі дні беларускай гісторыі, арганізаваныя сумесна з гістарычным факультэтам. Гэта здарылася ўпершыню і адразу зацікавіла вялікую колькасць студэнтаў.***

# ГІСТОРЫЯ НАС АБ'ЯДНАЛА...

У першы дзень прайшла сустрэча з вядомымі беларускімі гісторыкамі, выкладчыкамі БДУ. Студэнтам было цікава пазнаёміцца з людзьмі, па чыіх падручніках яны займаліся ў школе, чые кнігі чыталі ў вольны час. Пасля выступленняў выкладчыкаў моладзь мела магчымасць задаць ім пытанні на гістарычныя тэмы.

На другі дзень студэнтам прапанавалі паўдзельнічаць у гістарычнай віктарыне "Каралеўская бітва". Пытанні ў ёй былі не толькі па гісторыі Беларусі, але і БДУ, і сусвету. У напружанай канкурэнцыі вызначыліся пераможцы, якія атрымалі ад гістарычнага факультэта дыпломы і кнігі.

Дні беларускай гісторыі паказалі, што сваім мінулым цікавяцца не толькі студэнты, якім гэта ўласціва паводле роду прафесіі. Гістарычная спадчына аб'яднала моладзь розных факультэтаў і спрычынілася да ўзнікнення добрай традыцыі цікавых і пазнавальных сустрэч.

Іна ІВАНОВА

НА ЗАМЕТКУ

# ЧАСОПІС "САФІЯ"

***Выйшаў у друк чарговы нумар альманаха Саюза жанчын БДУ "Сафія".***

У ім можна прачытаць матэрыялы пра ахову дзяцінства, сённяшняе сацыяльнае жыццё беларускіх жанчын, электрамагнітную бяспеку, народную педагогіку беларусаў, этыкет і моду ў жыцці сучаснай жанчыны, дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ і Мінскага міжнароднага жаночага клуба жонак паслоў і дыпламатаў, праблему сэксуальнай эксплуатацыі жанчын і інш.

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

З 14 красавіка па 14 мая ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі пройдзе выстава сучаснай мастацкай творчасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў "Арт-Акадэмія", дзе Студэнцкі гарадок БДУ будзе дэманстраваць працы сваёй мастацкай майстэрні-студыі.

Закончыўся прыём заявак на ўдзел у II Адкрытым гарадскім маладзёжным фестывалі відэаролікаў "Кінагрань". Усяго пададзена каля 80-ці прац. Плануецца, што падчас конкурснага паказу, які пройдзе 23–25 красавіка ў відэакомплексе "Цэнтр-відэа" (ГЦ "Сталіца") і кінатэатры "Цэнтральны", будзе дэманстравацца каля 40 ролікаў.

З 18 па 20 красавіка ў САК "Брыганціна" адбылася традыцыйная "Школа студэнцкага актыву" для нованабраных студсаветаў інтэрнатаў. Акрамя вучобы, моладзь возьме ўдзел у спартыўных, забаўляльных мерапрыемствах, зможа задаць хвалюючыя пытанні на прэс-канферэнцыі кіраўніцтву універсітэта і прадстаўнікам дзяржаўнай улады. Таксама ў "Брыганціне" пройдзе фінальная частка конкурсу "Студэнцкі лідар года" Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

З 15 па 18 красавіка ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі прайшла XI Рэспубліканская выстава навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага досведу "Маральна-прававое і сямейнае выхаванне, прафілактыка процiпраўных паводзін дзяцей і навучэнскай моладзі". Студгарадок БДУ быў прадстаўлены метадычнымі выданнямі, відэаматэрыяламі і газетай "Студэнцкі гарадок".

АКЦЫІ

# КІНЬ ЦЫГАРЭТУ!

***Спаленнем цыгарэт 4 красавіка закончылася акцыя студэнтаў фізічнага факультэта "Цыгарэты на цукеркі", накіраваная на прапаганду здаровага ладу жыцця і адмаўлення ад курэння.***

З 31 сакавіка прадстаўнікі студэнцкага савета па якасці адукацыі фізфака праводзілі наглядную агітацыю супраць курэння з дапамогай плакатаў, лозунгаў, інфармацыйных матэрыялаў, што былі развешаныя па ўсім факультэце. Актывісты падрыхтавалі шырокае інтэрв'ю з дэканам, дзе акцэнтавалі ўвагу на дадзенай тэме, і апыталі аўтарытэтных выкладчыкаў, выказванні якіх таксама выкарысталі ў асветніцкай працы. Галоўнай "фішкай" мерапрыемства стаў масавы абмен цыгарэт на розныя ласункі. Сабраныя такім чынам тытунёвыя вырабы пры вялікай колькасці народу былі ахвяраваныя агню каля "курылкі" фізічнага факультэта выкладчыкам кафедры фізвыхавання і спорту Сяргеем Маўчанам. Гэтая акцыя праводзілася студэнтамі факультэта ўжо другі раз напярэдадні Дня фізікі і была прызначаная, у першую чаргу, для студэнтаў-першакурснікаў.

Аляксей МАКСІМЕНКА
Фота аўтара



*Падрыхтоўка да рытуалу...*



*...і яго завяршэнне.*

КОНКУРСЫ

# КАЛЕДЖЫСТЫ-ПАЛІГЛОТЫ

***У Юрыдычным каледжы БДУ 10 красавіка ў трэці раз прайшоў тэатральна-лінгвістычны фестываль "Omnes linguae" ("Усе мовы"), у якім упершыню ўдзельнічалі навучэнцы Бабруйскага аграрна-эканамічнага каледжа і Аршанскага механіка-эканамічнага каледжа.***

Праграма фестывалю ўключала 18 нумароў на 7-мі мовах: англійскай, нямецкай, французскай, італьянскай, кітайскай, японскай і лацінскай. У выніку "Гран-пры" фестывалю было прысуджана навучэнцу III курса Юрыдычнага каледжа БДУ Паўлу Траяну за выступленне на англійскай мове "Talk-show «Let them speak»". Пастаноўка ўяўляла сабой карыкатуру на сяброўскую гутарку кандыдатаў на пост прэзідэнта ЗША, якіх вядучы шоу Андрэй Малахаў (яго ролю сыграў сам пераможца) запрасіў у тэлевізійную студыю. Выканаўцы па-майстэрску пераўвасобіліся ў вобразы сваіх герояў, што і было адзначана журы. Акрамя таго, навучэнцы Юркаледжа перамаглі ў намінацыях "Найлепшая лінгвістычная пастаноўка" і "Найлепшая тэатральная пастаноўка". У намінацыі "Найлепшы музычны нумар" пяршынства ўзяла госця з Бабруйска Настасся Парашчук за песню "Everything I do". Спецыяльны прыз журы ў намінацыі "Найлепшы дуэт" атрымалі навучэнцы з Оршы Юлія Парахневіч і Павел Жалязноўскі за песню "The souvenir". Апрача таго, журы прызнала самым тэмпераментным выступленне навучэнцаў II курса Юркаледжа з песняй на італьянскай мове "Sara perche ti amo", а найбольш рамантычным быў названы нумар навучэнца I курса Юркаледжа на французскай, кітайскай і нямецкай мовах "La trilogie d'amor". Удзельнікам мерапрыемства ўручылі дыпломы і памятныя сувеніры, а пераможца атрымаў кубак з сімволікай фестывалю.



Каміла АРЫСТАВА

## З УСМЕШКАЙ

Вядомы аўстрыйскі хімік Адольф Франк падчас іспыту сказаў аднаму студэнту:

– Вы надзіва кемлівы чалавек. Галоўнае – Вы ўмееце ў нямногіх словах выказаць вялікую колькасць глупстваў...

***

Сустракае майстар свайго выкладчыка па "вышцы", якога не бачыў гадоў восем пасля заканчэння ВНУ. Разгаварыліся, узгадалі былыя часы. Прафесар пытаецца:

– Вось я вам чытаў тры гады вышэйшую матэматыку. Скажыце, у Вашым жыцці яна калі-небудзь спатрэбілася?

Студэнт, падумаўшы:

– А быў жа адзін выпадак.

– Вельмі цікава, распавядзіце. І мне будзе чым запэўніць студэнтаў на лекцыях, што вышэйшая матэматыка – не такая ўжо абстрактная навука і ў жыцці часам бывае патрэбная.

– Неяк ішоў я па вуліцы і мне ветрам знясло капялюш у лужыну. Дык я ўзяў кавалак дроту, загнуў яго ў форме інтэграла і дастаў капялюш!

***

Прафесар ветліва ўсміхаецца студэнту, які прыйшоў на іспыт і дужа нярвуецца.

– Мы, здаецца, ужо знаёмы, – з бадзёрасцю гаворыць ён. – Ці не сустракаліся мы з Вамі раней?

– Так, я летась здаваў Вам іспыт. Але, на жаль, правaліўся.

–Ну, на гэты раз, я ўпэўнены, што ўсё будзе выдатна. Ці не памятаеце Вы, якое я тады задаў пытанне?

–Вы запыталіся: "Ці не сустракаліся мы з Вамі раней?"

***

Студэнт пятага курса гаворыць маці:

– Сёння здаю іспыт.

– Які?

– Не ведаю пакуль. Вось прыйду ва універсітэт – там сябры скажуць.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

21 красавіка 2008 года
Падпісана да друку 18.04.2008 г.
Зак. 403. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by